# РАСІЙСКАЯ СУЧАСНАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ГІСТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў СКЛАДЗЕ ПОЛЬШЧЫ (1918–1939 гг.)

**_А. М. Загідулін_**

*Установа адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы», вул. Ажэшкі, 22, 230023, г. Гродна, Беларусь, azagidulin@grsu. by*

У артыкуле разглядаюцца асноўныя накірункі вывучэння гісторыі Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы (1918–1939 гады) сучаснымі расійскімі гісторыкамі. Вызначаны асноўная тэматыка і метадалагічныя падыходы расійскай гістарыяграфіі. Беларускае пытанне разглядалася пераважна ў кантэксце савецка-польскіх адносін. Вывучалася таксама рэлігійна-культурнае развіццё Заходняй Беларусі.

***Ключавыя словы:*** Заходняя Беларусь; сучасная расійская гістарыяграфія; савецка-польскія адносіны.

# РОССИЙСКАЯ СОВРЕМЕННАЯ ИСТОРИОГРАФИЯ ИСТОРИИ ЗАПАДНОЙ БЕЛАРУСИ В СОСТАВЕ ПОЛЬШИ (1918–1939 гг.)

**_А. Н. Загидулин_**

*Учреждение образования «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы», ул. Ожешко, 22, 230023, г. Гродно, Беларусь, azagidulin@grsu. by*

В статье рассматриваются основные направления изучения истории Западной Беларуси в составе Польши (1918–1939 годы) современными российскими историками. Определены основная тематика и методологические подходы российской историографии. Белорусский вопрос рассматривался преимущественно в контексте советско-польских отношений. Изучалось также религиозно-культурное развитие Западной Беларуси.

***Ключевые слова:*** Западная Беларусь; современная российская историография; советско-польские отношения.

# RUSSIAN MODERN HISTORIOGRAPHY OF THE HISTORY OF WESTERN BELARUS IN POLAND (1918–1939)

**_A. M. Zahidulin_**

*Yanka Kupala State University of Grodno, 22 Orzheshko str., 230023, Grodno, Belarus, azagidulin@grsu. by*

The article examines the main directions of studying the history of Western Belarus as part of Poland (1918–1939) by modern Russian historians. The main themes and methodological approaches of Russian historians have been determined: Belarusian question was considered mainly as one of the factors of Soviet-Polish relations. The religious and cultural development of Western Belarus was also studied.

***Key words:*** Western Belarus; modern Russian historiography; Soviet-Polish relations.

Гісторыя заходнебеларускіх зямель у складзе Польшчы ў міжваенны перыяд даследавалася расійскімі вучонымі досыць рэдка. У савецкі

перыяд становішча беларусаў у складзе Польшчы ў 1921–1939 гг. разглядалася з мэтай абгрунтаваць правы Савецкага Саюза на Заходнюю Беларусь (як і на Заходнюю Украіну). Аб’ектам вывучэння станавіліся, у першую чаргу, цяжкае становішча працоўных Заходняй Беларусі, а таксама нацыянальна-вызваленчы і рэвалюцыйны рух. У постсавецкі перыяд у расійскай гістарыяграфіі пачынае панаваць «прагматычны» падыход, які не прадугледжвае больш абарону інтарэсаў брацкай савецкай рэспублікі, а разглядае гістарычныя праблемы беларусаў, зыходзячы з нацыянальных і дзяржаўных інтарэсаў Расіі і Савецкага Саюза. Таму праблема беларусаў у Польшчы ў 1918–1939 гадах разглядаецца ў кантэксце савецка-польскіх адносін, савецка-польскай вайны 1919–1920 гг., заключэння Рыжскага мірнага дагавора і г. д. [1; 2; 3; 4; 5; 6].

Інстытуцыянальнымі цэнтрамі расійскай беларусістыкі заўсёды з’яўляліся і застаюцца па сённяшні дзень Інстытут славяназнаўства РАН, таксама Цэнтр гісторыі Расіі, Украіны і Беларусі Інстытута ўсеагульнай гісторыі РАН, кафедра гісторыі паўднёвых і заходніх славян гістарычнага факультэта МДУ імя М. В. Ламаносава.

У Расійскай Федэрыцыі існуюць гістарыяграфічныя работы, нават абароненыя дысертацыі, прысвечаныя вывучэнню польска-расійскіх навуковых сувязяў [7]. Ускосна тэматыку беларусаў у Польшчы ў 1920-я–30-я гады закранае даследчая работа створанай у 1965 г. Камісіі гісторыкаў Расіі і Польшчы. Камісія дзейнічае па сённяшні дзень і рэгулярна праводзіць вельмі прадстаўнічыя канферэнцыі.

У цяперашні час у Расійскай Федэрацыі найбуйнейшым спецыялістам па беларускай праблематыцы XIX–першай паловы XX стагоддзяў з’яўляецца былы супрацоўнік Інстытута славяназнаўства РАН, дацэнт гістарычнага факультэта МДУ імя М. В. Ламаносава, выхадзец з Беларусі Ю. А. Барысёнак. У 2013 г. убачыла свет яго манаграфія «На крутых поворотах белорусской истории: Общество и государство между Польшей и Россией в первой половине XX века», у якой, фактычна, упершыню ў сучаснай расійскай гістарыяграфіі асвятляюцца такія пытанні як фарміраванне нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў на фоне расійска-польскага супрацьстаяння, утварэння беларускай дзяржаўнасці, роля ў гэым працэсе наркама па справах нацыянальнасцей І. В. Сталіна. На думку аўтара, «пры вырашэнні беларускіх праблем, у тым ліку і тэрытарыяльных пытанняў, пад увагу браліся ў першую чаргу не этнаграфічныя і нават не сацыяльна-эканамічныя аргументы, а прынцып палітычнай мэтазгоднасці, шчыльна пераплецены с так званай польскай інтрыгай» [8, с. 20]. Ю. А.

Барысёнак адзначае, што ў кіраўніцтве Савецкай Расіі існавала некалькі пазіцый па вырашэнні нацыянальнага пытання буфернай рэспублікі. І менавіта І. Сталіну, на думку Ю. А. Барысёнка, належыць ідэя надаць створанай у ліпені 1920 г. ССРБ беларускае моўнае і культурнае аблічча. Дадзеная ідэя прагучала ў выступленні І. Сталіна на X з’ездзе РКП(б) [8, с. 96]. Ю. А. Барысёнак лічыць навукова несапраўднымі найбольш распаўсюджаныя гістарыяграфічныя канцэпцыі прычын беларусізацыі: 1) увасабленне нацыянальнай палітыкі камуністычнай партыі; 2) нацыянальная інтэлігенцыя як ініцыятар і аўтар палітыкі беларусізацыі. Даследчык даказвае, што беларусізацыя з’яўлялася геапалітычным эксперыментам часткі савецкага кіраўніцтва, які датычыў стварэння Беларускай савецкай рэспублікі, а далей і правядзення беларусізацыі. Прычынай дадзенага эксперымента Ю. А. Барысёнак лічыць імкненне перахапіць ініцыятыву ў Польшчы [8, с. 99]. Федэрацыйныя ідэі Ю. Пілсудскага, распрацаваныя, як сцвярджае Ю. А. Барысёнак, яго саратнікам Л. Васілеўскім, засталіся на паперы. Разлічаная на фарміраванне ва ўкраінцаў і беларусаў прыхільнасці да Польшчы, федэрацыйная праграма засталася незапатрабаваная праз вайсковыя поспехі палякаў у 1920 г.

Ю. А. Барысёнак называе стварэнне і развіцццё беларускай дзяржаўнасці, беларусізацыю пабочным вынікам асноўнага тактычнага хода Сталіна – нейтралізацыі і падаўлення польскага ўплыву ў рэгіёне [8, с. 104].

У сваёй рэцэнзіі на польскую публікацыю дакументаў «Вузел польска-беларускі 1918–1921» Ю. А. Барысёнак палемізуе з В. Матэрскім – аўтарам-укладальнікам дадзенага зборніка. Расійскі вучоны не пагаджаецца з тэзісам В. Матэрскага аб слабасці беларускага нацыянальнага руху ў разглядаемы перыяд. Ю. А. Барысёнак адзначае, што вузкі слой нацыянальнай беларускай інтэлігенцыі ў першым пакаленні абапіраўся на шырокую сацыяльную базу нацыянальнага руху. Таксама маскоўскі гісторык крытыкуе зручнае для савецкай гістарыяграфіі штучнае звядзенне беларускага нацыянальнага руху толькі да несавецкай яго часткі. Нацыянальны рух, на думку Ю. А. Барысёнка, лагічна разглядаць комплексна, аб’ядноўваючы яго савецкі і несавецкі варыянты, якія на самай справе мелі шмат агульнага. Менавіта так дадзеная праблема выкладаецца ў важным дакуменце, што ўпершыню публікуецца ў зборніку, – у фрагментах данясення агента польскай разведкі Раймунда

Ніхольма ад 19 лістапада 1920 г. пра яго размовы ў кулуарах мірнай канферэнцыі ў Рызе (s. 662–667) [9].

Ю. А. Барысёнак з’яўляецца пастаянным аўтарам «беларускай старонкі» ў расійскай гістарычнай перыёдыцы, надае шмат увагі канкрэтным праблемам гісторыі Заходняй Беларусі. Неабходна адзначыць яго папулярны артыкул «Жалезны чалавек Прытыцкі» у часопісе «Родина», у якім аўтар захапляецца ўчынкам дзеяча заходнебеларускага камуністычнага руху [10] .

Беларуская праблематыка ў кантэксце савецка-польскіх адносін стала прадметам даследавання супрацоўніцы Інстытута славяназнаўства Д. А. Каратковай. У 2015 г. яна абараніла кандыдацкую дысертацыю «Беларусь у савецка-польскіх адносінах у 1918–1921 гг.» [11]. Д. А. Каратковa прызнае для беларусаў важнасць і, нават, пэўную карысць Рыжскага мірнага трактата, які «значыў для Беларусі, з аднаго боку, падзел этнічных беларускіх тэрыторый, а з другога, міжнароднае прызнанне БССР у якасці адзінага ачага нацыянальнай беларускай дзяржаўнасці» [11, с. 19]. У палажэннях, выненесеных на абарону, Д. А. Караткова лёгка і адназначна фармулюе досыць традыцыйныя для расійскай гістарыяграфіі пастулаты адносна ролі і магчымасцей беларусаў у станаўленні сваёй дзяржаўнасці: «Палітыка Германіі на акупаваных беларускіх тэрыторыях была вытворнай ад яе адносін з польскімі і літоўскімі палітычнымі сіламі і не кіравалася мэтай стварыць суверэнную Беларускую дзяржаву. Таму абвешчаная ў сакавіку 1918 г. Беларуская народная рэспубліка не атрымала нават тых абмежаваных паўнамоцтваў, якія былі прадстаўлены немцамі Польскаму каралеўству і літоўскай Тарыбе» [11, с. 30]. Таксама гісторык сцвярджае, што «першая савецкая Беларуская рэспубліка была абвешчана ў рамках т. зв. «палітыкі буферызму» Масквы, якая прадугледжвала стварэнне вакол РСФСР пояса фармальна самастойных савецкіх дзяржаў ускраінных народаў для ўскладнення ўмяшальніцтва дзяржаў Антанты ў грамадзянскую вайну і разглядалася бальшавіцкім кіраўніцтвам толькі як інструмент гэтай палітыкі. Аднаўленне ж БССР у 1920 г. было часткова адказам Крамля на польскі федэралізм, часткова кампанентам адроджанага па рашэнні пленума ЦК РКП (б) ад 16 ліпеня 1920 г. плана саветызацыі Польшчы» [11, с. 31]. Такім чынам, Д. А. Караткова адмаўляе самастойнасць ролі беларускіх нацыянальных сіл розных палітычных накірункаў ва ўтварэнні ўсіх форм беларускай дзяржаўнасці.

Д. А. Караткова таксама дастаткова адназначна характарызуе прычыны і мэты польскай палітыкі ў Заходняй Беларусі ў 1918–1921 гадах: «Польскія тэрытарыяльныя прэтэнзіі ў беларускім рэгіёне былі абумоўлены імкненнем Варшавы альбо забяспечыць уваходжанне ў склад Польскай дзяржавы літоўскіх тэрыторый з Вільняй як часткі І Рэчы Паспалітай, альбо устанавіць цесныя саюзніцкія сувязі з незалежнай Літвой. У сувязі з гэтым заходнебеларускія землі разглядаліся як частка былога Вялікага княства Літоўскага і ўключалася ў сферу польскіх жыццёвых інтарэсаў. Кароткачасовая цікавасць да праекта «беларускага Пьемонта» на гэтых тэрыторыях была часткай дыпламатычнай гульні у адносінах з Літвой, Савецкай Расіяй і Захадам» [11, с. 30]. Дысертацыя Д. А. Каратковай увасобілася ў 2019 г. у манаграфію [12]. Д. А. Караткова дае цікавае тлумачэнне няўдзелу беларусаў у вырашэнні свайго лёсу на перамовах у Рызе 1920–1921 гг. Прайграная савецка-польская вайна патрабавала тэрытарыяльных уступак за кошт беларускіх земляў. Беларусы ж, як камуністы, так і «нацыяналісты», маглі сваёй пазіцыяй абурэння сарваць дамоўленасці з Польшчай, якую кіраўніцтва Савецкай Расіі змусіла прызнаць УССР і БССР [12, с. 181].

Найноўшым па часе даследаваннем Д. А. Каратковай з’яўляецца аналіз поглядаў на вырашэнне беларускага пытання знакамітага польскага грамадска-палітычнага дзеяча, найважнейшага тэарэтыка польскай нацыянальнай палітыкі, паплечніка Ю. Пілсудскага, эксперта па беларусах Леана Васілеўскага. Аўтарка разглядае шэраг публікацый палітыка, называе яго прыхільнікам ідэй федэралізму. Гісторык адзначае, што Л. Васілеўскі паслядоўна выступаў за прадастаўленне беларускай нацыянальнай меншасці шэрагу магчымасцей у рэалізацыі сваіх нацыянальна-культурных запатрабаванняў. Д. А. Караткова ў назве сваёй публікацыі выкарыстоўвае тэрмін «эвалюцыя» ў дачыненні да поглядаў Л. Васілеўскага на вырашэнне беларускага пытання. Тым не менш, робячы высновы, даследчыца адзначае, што пазіцыя Л. Васілеўскага засталася нязменнай на працягу ўсяго перыяду яго дзейнасці, проста ў 1930-я гады, у пачатку разгулу польскай рэакцыі паплечнік Ю. Пілсудскага перастаў адстойваць у друку свае погляды, каб не пярэчыць дзяржаўнай палітыцы. Бо важнейшай каштоўнасцю для Л. Васілеўскага з’яўлялася нацыянальная бяспека польскай дзяржавы [13, с. 56].

Фактычна, адзіным даследаваннем, прысвечаным унутрыпалітычнай заходнебеларускай праблематыцы, стала кандыдацкая дысертацыя, выкананая ў Інстытуце славяназнаўства РАН і абароненая ў 2016 г.

беларускім даследчыкам А. Л. Дарковічам «Гарадское самакіраванне на заходнебеларускіх землях міжваеннай Польшчы (1919–1939 гг.)» [13]. Нягледзечы на досыць вузкую і канкрэтную тэму, дысертант разглядае ўзровень урбанізацыі Заходняй Беларусі, дынаміку колькасці гарадскога насельніцтва, «дзяржаўную асіміляцыю» як адну з праграм нацыянальнай палітыкі Польшчы. Толькі трэцяя глава прысвечана розным формам дзейнасці органаў гарадского самакіравання, у тым ліку і фінансавай.

У палажэннях, што выносяцца на абарону, А. Л. Дарковіч прытрымліваецца традыцыйнай для савецкай і расійскай гістарыяграфіі канцэпцыі эканамічнага развіцця Заходняй Беларусі «аграрна-сыравіннага прыдатку Польшчы»: органы мясцовага самакіравання з'яўляліся праваднікамі палітыкі паланізацыі, яны паступова гублялі сваю самастойнасць, ператвараючыся ў прыдатак дзяржаўнай адміністрацыі, перспектывы развіцця заходнебеларускіх гарадоў адсутнічалі [14, с. 28–29].

Заходнебеларускую рэчаіснасць даследуюць супрацоўнікі аддзела ўсходняга славянства Інстытута славяназнаўства РАН Ю. А. Лабынцаў і Л. Л. Шчавінская. Вядомыя філолагі, гісторыкі культуры, яны з'яўляюцца спецыялістамі ў шырокай сферы праваслаўнай культуры на беларуска-польскай і ўкраінска-польскай межах. Адным з найважнейшых накірункаў шматвектарнай дзейнасці вучоных з'яўляюцца даследаванні беларуска-ўкраінска-рускай праваслаўнай літаратуры ў міжваеннай Польшчы [15]. Аўтары ўводзяць у навуковы зварот значны масіў праваслаўных сачыненняў, створаных на тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны і выяўленых у выніку работы экспедыцыі 1996 г. Ю. Лабынцаву і Л. Л. Шчавінскай удалося апісаць і раскрыць грамадска-культурны феномен праваслаўя, што склаўся ва ўмовах каталіцкай краіны. Прааналізавана таксама творчасць самабытных праваслаўных аўтараў і прапаведнікаў, такіх як сенатар В. В. Багдановіч, протапрасвітар Цярэнцій Тэадаровіч і інш. [16; 17; 18].

Працягваючы вывучэнне культурна-рэлігійнага развіцця Заходняй Беларусі, Ю. А. Лабынцаў аналізуе біяграфію і гістарычную творчасць заходнебеларускага асветніка і грамадска-рэлігійнага дзеяча ксяндза А. Станкевіча [19]. Адна з ранніх публікацый Ю. А. Лабынцава, прысвечаных заходнебеларускай культуры, апісвае лёс калекцыі дакументальных помнікаў Беларускага музея імя Івана Луцкевіча ў Вільні [20]. Даследаванне вучонымі заходнебеларускіх праваслаўных артэфактаў развіваецца ў вывучэнне міжканфесійнага дыялогу ў Заходняй Беларусі, у

які ўцягнуты беларускі каталіцкі рух і пратэстанцкія суполкі, што мелі распаўсюджанне, у першую чаргу, сярод беларусаў, знявераных у праваслаўі. Л. Л. Шчавінская даследавала праваслаўныя песні і тэксты, створаныя для супрацьстаяння пашырэння пратэстантызму ў праваслаўным асяроддзі Заходняй Беларусі [21]. Адзін з артыкулаў Ю. А. Лабынцава прысвечаны ўнікальнай з'яве заходнебеларускга рэлігійна - культурнага асяроддзя: рукапісным зборнікам пратэстанцкіх рэлігійных песень. Аўтарам выяўлены і апісаны створаныя ва ўмовах польскай рэлігійнай палітыкі арыгінальныя беларускамоўныя пратэстанцкія песні, вершы і гімны, якія не заўсёды адпавядалі пратэстанцкаму веравучэнню і часам зведвалі крытыку афіцыйных прапаведнікаў [22].

Гісторыя Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы ў 1918–1939 гадах нячаста трапляе ў аб'ектыў сучасных расійскіх вучоных. Беларусы пераважна не прызнаюцца суб'ектам гістарычных падзей ва Усходняй Еўропе 1918–1939 гадоў, а разглядаюцца як аб'ект расійскай і польскай палітыкі. У той жа час вывучаецца самабытная культура праваслаўнага беларуска-польскага памежжа.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Яжборовская И. С., Парсаданова В. С. Россия и Польша. Синдром войны 1920 г. М.: Академия, 2005.
2. Мельтюхов М. И. Советско-польские войны: военно-политическое противостояние 1918–1939. М.: Вече, 2001.
3. Мельтюхов М. И. 17 сентября 1939 : советско-польские конфликты 1918–1939. М.: Вече, 2009.
4. Мельтюхов М. И. Красная армия и несостоявшаяся революция в Германии (1923 г.). М.: АИРО-XXI, 2009.
5. Михутина И. В. Польско-советская война. 1919–1920 гг. М.: ИСБ РАН, 1994.
6. Бабенко О. В. Польско-советские отношения в 1924–1928 гг.: от противостояния к сотрудничеству. М.: ИНИОН РАН, 2007.
7. Кэндзёра С. Э. Польско-Российские научные и культурные отношения в конце XX – начале XXI вв. Автореф. дисс…канд. ист. наук. 07. 00. 03. Казань, 2015.
8. Борисенок Ю. А. На крутых поворотах белорусской истории: Общество и государство между Польшей и Россией в первой половине XX века. – М.: ООО «Родина МЕДИА», 2013.
9. Борисенок, Ю. А. «Польско-белорусский узел» 1918–1921 гг. в интерпретации современной польской историографии. Рецензия на Materski W. (wybór i opracowanie). Węzeł polsko-białoruski 1918–1921. Dokumenty i materiały. Warszawa, 2018. 868 s. // Славянский альманах. 2020. № 3–4. с. 568–578.
10. Борисенок, Ю. А. Железный человек Притыцкий // Родина. 2019. № 10. С 101–102.
11. Короткова Д. А. Белоруссия в советско-польских отношениях в 1918–1921 гг. автореф. дис…. канд. ист. наук 07. 00. 03 – всеобщая история (Новое и новейшее время). М.: МГУ имени М. В. Ломоносова, 2015.

12. Короткова Д. А. Белорусские земли в советско-польских отношениях. Разменная карта в противостоянии двух держав. 1918–1921 гг. М.: Центрполиграф, 2019.
13. Короткова Д. А. Эволюция взглядов Леона Василевского на белорусский вопрос // Славяноведение. 2021. № 3. С. 50–56. DOI: 10. 31857/S0869544X0014978-8.
14. Даркович А. Л. Городское самоуправление на западнобелорусских землях межвоенной Польши. Автореф. дис…канд. ист. наук. 07. 00. 03 – Всеобщая история (Новая и новейшая). М.: Институт славяноведения РАН, 2016.
15. Лабынцев Ю. А., Щавинская Л. Л. Белорусско-украинско-русская православная книжность межвоенной Польши: исследования и публикации по материалам экспедиции 1996 г. М.: Индрик, 1999.
16. Лабынцев Ю., Щавинская Л. Православная культура Польши (1918–1939 гг.). Мн.: Нац. б-ка Беларуси, 2001.
17. Лабынцев Ю., Щавинская Л. Литературное наследие В. В. Богдановича – белорусского сенатора II Речи Посполитой // Славяноведение. 1997. № 3. С. 47–52.
18. Лабынцев Ю. А. Щавинская Л. Л. Белорусский сенатор, литератор, издатель Вячеслав Богданович – современник Янки Купалы и Якуба Коласа // Янка Купала і Якуб Колас у сістэме дзяржаўна-культурных і духоўна-эстэтычных прыярытэтаў XXI стагоддзя. Матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 26–27 вер. 2007 г.) / Ін-т літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі. Мн.: Права і эканоміка, 2007. С. 202–207.
19. Лабынцев, Ю. А. Историограф белорусского национального движения в Костеле: ксендз Адам Станкевич // Славянский альманах. 2019. № 1–2. С. 254–269.
20. Лабынцаў Ю. А. Архіў беларускага адраджэння: (Дакументальныя помнікі беларускай царкоўнай і грамадзянскай гісторыі ў зборах Музея імя Івана Луцкевіча ў Вільні). Мн.: Нац. б-ка Беларусі, 1993.
21. Щавинская Л. Л. Западнобелорусская народная рукописная православная книжность в полемике с местными протестантскими движениями во II Речи Посполитой // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў : зб. навук. арт. Вып 2. Цэнтр даслед. беларускай культуры, мовы і літ-ры. Мн.: Права і эканоміка. С. 581–584.
22. Лабынцев Ю. А. Протестантские певческие рукописи в западнобелорусском народном обиходе первой половины XX вв. // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў : зб. навук. арт. Вып 2. Цэнтр даслед. беларускай культуры, мовы і літ-ры. Мн.: Права і эканоміка. С. 581–584.